# СТРАШНЫЯ КРОКІ ВАЙНЫ

## З успамінаў Н. П. Марцуль, г.п.Вялікая Бераставіца

Няпоўных дзесяць год споўнілася тады Ніне Піліпаўне Марцуль з Вялікай Бераставіцы (дзяўчынка тады жыла ў Эймінаўцах), як першыя выбухі снарадаў і бомбаў нагадалі аб пачатку самай жорсткай і крывавай вайны ў гісторыі чалавецтва. Малой дзяўчынцы здавалася тады, нібыта раптам зніклі ўсе яркія летнія фарбы, а ўсё навокал было памалявана ў чорны колер. Страх агарнуў і дарослых, і дзяцей. Ён, як злавесны цень, крочыў за імі паўсюдна.

Баяліся кульгавага немца, які кіраваў спіртзаводам у Кузьмічах і часта праязджаў праз вёску Эймінаўцы. Асабліва мужчыны страшыліся сустрэчы з ім, бо не дай Бог, не скінеш своечасова шапкі, адразу «пачастуе» гумай.



*Н. П. Марцуль.*

Баяліся самалётаў з крыжамі ў небе. Хоць часамі дзіцячая дапытлівасць перасільвала страх.

- Аднойчы мы, дзяўчынкі,- кажа Ніна Піліпаўна - вырашылі схадзіць да падбітых танкаў, якія віднеліся непадалёку за вёскай, на балоце. Хацелася паглядзець, што ў іх ў сярэдзіне. Мне яшчэ галаву прыціснула, як у люк залазілі. Раптам бачым самалёты ў небе з крыжамі... Як жа ўзрадаваліся нашы мамы, калі мы, ўцалеўшыя, прыбеглі дамоў.

- Мы жылі на хутары,- успамінае далей Ніна Піліпаўна. - Таму страху нацярпеліся значна больш за вясковых. Вельмі баяліся кожную ноч стуку ў акно. Спачатку наведваліся былыя чырвонаармейцы, якія не паспелі адступіць разам з рэгулярнымі войскамі і цяпер хаваліся ў лясах. Бацькі іх ужо ведалі, заўсёды давалі ім што-небудзь з'есці.

Потым сталі наведвацца партызаны. Ім таксама хацелася есці і вопратка патрэбна была. А ў след за партызанамі, ці ў адказ на іх візіты, з'яўляліся самыя страшныя наведвальнікі - немцы. Яны строга папярэджвалі заяўляць акупацыйным уладам аб прыходзе ў вёску партызанаў.

- Памятаецца, закалолі нашы ўпотайкі кабана, - працягвае мая суразмоўца. - Употай таму, што палову тады трэба было немцам аддаваць. А хто хацеў аддаваць, калі самім не хапала? Мяса схавалі пад жолабам у хляве, нават каўбас традыцыйна нарабілі і павесілі сушыцца за печкаю.

На тую бяду акурат недзе ў нашых мясцінах партызаны аб'явіліся і немцам стала вядома пра гэта. Пачаліся аблавы, завіталі і да нас «няпрошаныя» госці. Абшуквалі ўсё і... знайшлі ў закутку развешаныя каўбасы. Немец як спалавеў, схапіў са сцяны рамень і давай ім маму лупцаваць. А я плачу, шкадую маму, нават абараніць яе спрабую. У адказ

рассвірапелы фрыц як штурхяне мяне, што я аж да процілеглага вакна даляцела.

Тут татка прыбег. Ён у вёсцы быў і даведаўся пра аблаву, думаў паспее каўбасы схаваць. Але... было позна. Прыйшлося яму паказаць і схаванае мяса, потым запрэгчы каня і адвезці ўсё у гміну, у Бераставіцу. А праз два тыдні прыехалі немцы і забралі нашага татку на два гады ў астрог у Саколку за тое, што мяса схавалі. Білі там страшна, потым расказваў ён, здзекваліся там з людзей неймаверна. Потым яшчэ і на работу ганялі. Як хто не мог ісці, на месцы адразу прыстрэльвалі.

Добра дзядзька дапамог. У яго знаёмы быў солтыс, а ў таго былі «сувязі» у Саколцы. Назбіралі мы ўсялякага дабра, пераважна тканых рэчаў, іх чамусьці надта любілі немцы, і завёз іх дзядзька свайму знаёмаму, каб той перадаў іх далей. Адпусцілі тады бацьку і яшчэ дваіх мужчын з нашых хутароў, якія таксама былі пасаджаны ў астрог, бо і за іх прасіў дзядзька.

Праўда не дамоў іх адпусцілі, а на працу да новага нямецкага гаспадара адправілі, у Князевічы. Адтуль бацька нават пару разоў да нас наведваўся, вядома з дазволу гаспадара. Нас двое дзяцей з мамай засталося ў той час. Старэйшага брата Шурыка ў 1943 годзе ў Германію забралі, а пазней такі самы лёс і сястру напаткаў. Яна апынулася ў Кёнігсбергу, на заводзе там працавала. Брат жа быў недзе ў бауэра. Нават некалькі пісем мы ад яго атрымалі. І з сястрою ён перапісваўся, а нарэшце ўцёк ад свайго гаспадара да яе, у Кёнігсберг. Не ведаю як, але яго таксама ўладкавалі працаваць на тым самым заводзе. Аднак у хуткім часе пачалося наступленне савецкіх войскаў, у выніку - усіх паднявольных работнікаў вызвалілі, але наш Шурык атрымаў пры гэтым раненне ў нагу. Яго, мабыць, забралі ў шпіталь, а сястры ён наказваў ісці дамоў, не чакаць яго. Два тыдні спатрэбілася ёй, каб пераступіць парог роднага дома. На жаль, з таго часу мы нічога не ведаем пра лёс нашага брата. Спрабавалі нават праз Чырвоны Крыж хоць якую-небудзь звестку атрымаць, а цяпер думаем звярнуцца ў праграму «Жди меня».

«Вось яны якія, лёсы дзяцей той страшнай ваеннай пары», - падумаў я, калі Ніна Піліпаўна прадоўжыла далей свой аповяд пра пасляваенныя гады. Хтосьці загінуў,- хтосьці прапаў без весткі. Але ж войны і не вызначаюцца нічым іншым, акрамя як разбуральнай сілай, горам і няшчасцем, якія дастаюцца ад іх мільёнам нічым не павінных людзей.

Сяргей Хілюта, г.п. Вялікая Бераставіца,
2010 год.